**Абласныя і Мінскае**
**гарадское ўпраўленні**
**адукацыі**
**Дзяржаўныя музеі**
**Рэспублікі Беларусь**

# Метадычнае пісьмо
# аб сумеснай дзейнасці музеяў

У сучасны момант дынамічна развіваюцца музеі навучальна-выхаваўчых устаноў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Удасканальваюцца формы культурна-асветніцкай і выхаваўчай дзейнасці, узрастае іх колькасць. На пачатак 2001 года іх сетка дасягнула больш за 1 тысячу музеяў. Складваюцца эфектыўныя формы сумеснай дзейнасці з дзяржаўнымі музеямі. Удасканальванню сумеснай работы паспрыяла, у значнай ступені, зацверджанае ў лістападзе 1999 года "Палажэнне аб музеі навучальна-выхаваўчай установы", якое было ўзгоднена з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь і ўнесена ў рээстр нарматыўных актаў Міністэрства юстыцыі рэспублікі.

Разам з тым, у практычных работнікаў музеяў навучальна-выхаваўчых устаноў узнікаюць пытанні па ўдакладненню некаторых раздзелаў Палажэння.

У адпаведнасці з гэтым удакладняем пункт 5.1. раздзела "Арганізацыя музея", які тычыцца пісьмовай інфармацыі ў дзяржаўныя музеі аб наяўнасці экспанатаў асноўнага фонду.

Як сведчыць аналіз, шматлікія музеі навучальна-выхаваўчых устаноў налічваюць па некалькі тысяч экспанатаў асноўнага фонду і зрабіць іх штогадовы пералік кіраўніку музея (настаўніку), які працуе на грамадскіх пачатках, даволі складана. У адпаведнасці з вышейазначаным тлумачым, што пісьмовая інфармацыя (п. 5.1.) перад рэгіянальным дзяржаўным музеем складаецца толькі аб наяўнасці экспанатаў асноўнага фонду, якія ўзяты на ўлік дзяржаўным музеем і з'яўляюцца найбольш каштоўнымі.

Для вырашэння пытанняў узаемаадносін дзяржаўных музеяў і музеяў навучальна-выхаваўчых устаноў рэкамендуем ствараць сумесныя камісіі, у склад якіх уключаць адказных супрацоўнікаў раенных аддзелаў культуры, адукацыі, дзяржаўных музеяў. Дзейнасць такіх камісій будзе садзейнічаць паляпшэнню асноўных накірункаў работы музеяў навучальных устаноў, асабліва захаванасці іх фондаў.

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі**

**Г.А. Бутрым**

**Начальнік аддзела музеяў і выставак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

**С.І. Маслоўскі**